# Птушкі і хаты.

У Беларусіпрайшлаакцыя“Птушкі на кармушцы”. Яна ладзілася ў рамкахзімовагаўліку крылатых. КаардынатарамвыступілаМядзельскаераён наеаддзяленнеграмадскайарганізацыі “АховаптушакБацькаўшчыны” (АПБ). Мэта – дапамагчыгэтымнасельнікам у самую цяжкую і галодную пару. І выпала яна на пачатак 2009-га – Года роднайзямлі.

Асабістамяневельміцікавіць, як жывеццазімой і ў пачаткувяснысініцам, боназіраю за імівельмідаўно ў нашым дачным садзе і агародзе, у лесе, якіпобач. Добрыяптушкі, якіясваіміпаводзінамі і звычкамі так узбагачаюцьнашужывуюпрыроду, дораць шмат вясёлых, забаўляльныххвілінвясковымжыхарам, і дзецямасабліва.

…Мы прыехалі з жонкай на дачу нядаўна, каліяшчэ было холадна і ўсё стыла пад снегам і лёдам. Падыходжу да кустоўпарэчкі і раптам чую: «ціў-ціў-ціў». Хтогэтападаеласкавыгаласок, падобны на тоненькізваночак? Сініца, добра ведаю. Але ж дзеяна? Ага, відаць, на яблыні, шторасце каля плоту. Яблыняпаўдзікая, шмат пладоў на ёйтрымаюццаўсюзіму, бояныкіслыя і цвёрдыя, мы іх не здымаем. Няхай, вырашылі, застаюцца на дрэве: у галодны час для некаторыхптушакгатовыполудзень. Так і выходзіць.

Бачу: на яблыніруплівa і ўвішна “працуюць” сініцы. Спрытнапераскокваюць з галінкі на галінку, учэпістатрымаюцца на саміхяблыках, дзяўбуцьіх. Аднасінічка, бы той акрабат, прыладзілася на яблыкуўнізгалавой і, нічогасабе, трымаеццаўпэўнена.

Трэбасказаць, штогэтаяяблыня як вялікая і ўтульнаяхароміна для птушак. Каржакаватая, разлапістая, з густой кронай. Звясны і да позняйвосені на ёйшчыруюць і сінічкі, і вераб’і. Дыйрасцедрэва ў ціхімкуточку, чужыялюдзі тут не ходзяць, а мы з жонкай стараемся лішні раз не палохацьптушак.

А зараз стаю і назіраю за сінічкамі. Адчуваю: яны ў нейкайтрывозе і адчаі. Усёзразумела: учора днём была адліга і церушыўнудныдождж, а сённямароз. Тоненькімлядкомзацягнула ствол і галіныдрэва, быццампакрытыянысуцэльнайплёнкай. А на зямлі – цвёрды пласт снегу. Дзе і як сініцамздабыць корм? Мне здаецца, янынастолькізаклапочаныгэтайпраблемай, іх так дапяклагаладоўка, што не звяртаюцьувагі на мяне. А можа, наадварот,чакаюць, штопамагуім, таму і не пакідаюцьдрэва.

Паварочваю назад, дахаты. І за маёйспіноюзноўтоесамаешчабятанне. Янонясмелае і слабае, відаць, у птушак проста не хапаесілмацнейпадацьголас. І мне быццамчуеццаіхняе: мы тут, мы тут. Быццамгаворацьсініцынасваёймове, штоянызастаюцца на гэтайяблыні, тольківосьбяда — няма тут ніякага корму. Я зараз добра разумею галодныхптушак і ведаю, што мне трэбарабіць.

На кухні ў хацебярупалавінубелага батона і дробненькаяго крышу. Ачышчаю ад снегу метры два дарожкі ля хаты, высыпаю тудыхлебныякрошачкі. Але не ўсе, часткуіх сыплю на шырокіліст фанеры, нясуяебліжэй да той самайяблыні, кладу на цвёрды снег…

Перадад’ездамгляджу ў бок яблыні: сінічкіўжотаўкуцца на лісце фанеры. Думаю, калі мы паедземадсюль, яны, канешне, заўважаць корм і на дарожцы. Цяпер я больш-меншспакойны: хоцькрыхупамоггалоднымптушкам. У наступны раз трэбаімпрывезцінарэзанаемаленькімікавала чкамісыроенесалёнае мяса ці сала – самылюбімыласунаксініц. Надзвычайлюбяцьяны і семкісланечніку, але іхняма ў нас на дачы. І вінаватысамі… сініцы. Жонкапасадзіла ў агародзенекалькісланечнікаў, янывымахалі на зай-здрасць, шапкібылі як тыяшырокіякапелюшы. Але ж як толькісемкікрыхупаспелі, сінічкі і ачысцілісланечнік. Не ведалі, што мы хацелічасткусемакпакінуцьімжа на зіму.

У нашайрэспубліцывыяўлена сем відаўгэтыхптушак. Вялікаясініцаводзіцца на ўсёйтэрыторыі, яна добра абжылася ў

лясах, дзе і ўтульна, і бяспечна, і корму летам хапае. Сады, паркітаксамаёйдаспадобы. Зімойцягнецца да жылля, дзелюдзі, боведае, што тут заўсёдыбудзекорм. Нузусім як з гэтымісініцамі на нашайдачы.

Яшчэ ў нас во-дзяццасініцыгубатая і чорная – аселыяптушкі, восенню і зімойвандруюцьчародкамі. Даўжыня цела сініц ад 10 да 15 сантыметраў, вага – крыхубольш за 23 грамы. Густое мяккаеапярэнне, кароткаямоцнаядзюба, янадазваляеімспрытнабраць розных, наватдробненькіх, насякомых у самых недаступныхмесцах. Дуплы, гнілыяпні, расколінырдрэў, штучныядупляні як найлепшпадыходзяцьсініцам для гнёздаў.

Сініцынясуць шмат яек – ад чатырох да чатырнаццаці. А вялікаянаватдвойчы на год, і патомства ў яепаўтарадзесятка— дваццацьптушанятак. Сініцы – карысныяптушкі, знішчаюцьшкодныхнасякомых. Гэтасапраўдныясанітарынашыхсадоў. Нястомныя ў працы, янырупліва і надзейнаачысцяцьусегалінкі, ствол той жаяблыніцігрушы. На жаль, кожнайвясной мы бачым, штосініцнамногаменш, чым было іхмінулайвосенню. Дзе ж яны? Загінулізімой ад галадоўкі. Самаестрашнае для сініц у гэтую пару – бяскорміца. Маразыасаблiванебяспечныя для паўгалодныхптушак, у іхпроста не хапаесілвытрымаць такую халадэчу. Тамуякраздарэчы тая самая акцыя “Птушкі на кармушцы”.

— Галоўнаяяемэта – прыцягнуцьувагулюдзей да праблемптушак, якія ў нас зімуюць, падкарміцьіх у цяжкую пару года, — расказвае Алена Паршута, каардынатарМядзельскагааддзялення АПБ. – Ну і аднавачасоваправесціўлік. Акцыяпраходзіла ў два самыяхалодныядні, уёйудзельнічалі 282 чалавекі. Якія ж вынікі? Высветлілася, што да нашыхкармушакпрылятаюць 28 відаўптушак. А ўсяго за два дні на гэтыхсвоеасаблівых “сталоўках” заўважанабольш за трытысячы крылатых. На першыммесцы – вялікаясініца, амаль тысяча рэгістрацый. Далей – вераб’ідамашнія і палявыя. Часцейсталіпрылятаць да кармушкісвірысцелі, якіявельміпадабаюцца нам.

— І хто ж асаблівастараннаклапоціццаабптушках?

— Безумоўна, школьнікі, што нас вельмірадуе. Гэта члены клубаў “Крылаты дазор”. Добра “па-працавалі” з птушкамі ў школах Шумілінскага, Мядзельскага, Дзятлаўскагараёнаў. Дзеціпрыслалі нам не толькізапоўненыя анкеты, але і свае дасціпныяаповядыпраназіранні за птушкамі, праіхпаводзіны. А члены гуртка “Золак” з Мінсканаватзнялі і прыслалівідэаролік — цікавырэпартажпра тое, як крылатыяласуюццарабінай. Удзельнічалі ў акцыі і дарослыя. Словам, у нас ёсць шмат птушыныхсяброў. Хачу толькісказаць: клопатыпраіх не трацяцьсваёйактуальнасці і на пачаткувясны. Снегу яшчэ шмат, ён за-крываерэшткі корму, тамуптушактрэбападкармліваць да таго часу, пакульснежнаепокрыва не сыдзепоўнасцю.

Як падкрэсліваеспецыяліст па эка-лагічнайадукацыі АПБ Руслан Шай-кін, вывучэннепаводзінптушак у зімовыперыяддаекаштоўнынавуковыматэры ял. У тымліку, канешне, і акцыя “Птушкі на кармушцы”. Мы атрымлі-ваемадказы на многіяважныяпытанні з жыцця “крылатаганасельніцтва” роднага краю.

**Источник:** Рэсп.-2009.-14 сак.-С. 6.